ПАДЗЕЯ

# І зноў салют і слёзы…

Нядаўна ў Карэліцкай раённай бібліятэцы адбылася літаратурна-музычная сустрэча пад назвай «И снова май, цветы, салют и слёзы», прысвечаная тэме Вялікай Айчыннай вайны. На чарговае пасяджэнне аматарскага аб’яднання, якім кіруе бібліятэкар Тамара Кардаш, сабраліся людзі сталага ўзросту. Кожны з іх расказаў пра сваіх сваякоў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Некаторыя жанчыны (Галіна Комар, Вера Сцяцко) прынеслі рэліквіі, якія захоўваюцца ў сем’ях, – узнагароды і дакументы сваіх родных. Ганна Козел прачытала ўласныя вершы пра вайну, пра перамогу.

Гэтая сустрэча дала мне магчымасць пазнаёміць удзельніц аб’яднання са зборнікам прозы і публіцыстыкі «Подых часу», які нядаўна выдаў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Увагу я засяродзіла на сваім нарысе «Лісты з фронту», у якім расказала пра нашых землякоў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, што загінулі на фронце, і пра лёс салдацкіх удоў. Кранулі слухачоў лісты з фронту, якія нашы землякі слалі сваім сем’ям. Сярод іншых – лісты паэта Алеся Мілюця з вёскі Скорычы Карэліцкага раёна да сястры Мані.

Удзельніцы аб’яднання чыталі вершы, расказвалі, успаміналі, спявалі песні ваенных гадоў. Сустрэча за кубачкам духмянай гарбаты атрымалася цёплай і душэўнай.

**Святлана КОШУР**
Карэлічы

**На фота:** літаратурна-музычная сустрэча пад назвай «И снова май, цветы, салют и слёзы», прысвечаная тэме Вялікай Айчыннай вайны. Карэліцкая раённая бібліятэка. Май 2023 года.


Літаратура
Брыль


ПОДЫХ ЧАСУ
ПРОЗА. ПУБЛІЦЫСТЫКА



Смерть немецким захватчикам!

ВОИНСКОЕ

Куда Барановской области
Р-он Мірской С/с Крынычловскі
деревня Лукі

Кому Мордзіловічу Пуне Семеновічу

Адрес отправителя: Полевая почта № Пол. Поч. № 45919
(указать номер полевой почты)

Мордзісловіч Борис Лукіч
(фамилия, имя, отчество)

Танкисты Красной Армии! Крушите и неотступно преследуйте врага! Умело и смелым маневром прорывайтесь в тылы противника, отрезайте пути отхода вражеским войскам, уничтожайте немецких захватчиков!
Да здравствуют советские танкисты!

ПРОСМОТРЕНО



**Выступае член Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўца Святлана Кошур**